*Чацверты этап гістарыяграфіі: развіццё беларускай фалькларыстыкі ў 1920-30-я гг.*

З пачатку 1920-х гг. у развіцці беларускай навукі адбываюцца істотныя перамены, звязаныя з яе інстытуцыяналізацыяй у створанай у 1919 г. БССР, што непасрэдна закранае і развіццё фалькларыстыкі ў краіне. Калі раней збор фальклорнага матэрыялу і яго далейшае вывучэнне ініцыяваўся асобнымі даследчыкамі-энтузіастамі ці некаторымі ўстановамі, якія займаліся вывучэннем усёй Расійскай імперыі, такімі як Рускае геаграфічнае таварыства і Расійскі этнаграфічны музей, то цяпер упершыню кіраваць гэтай дзейнасцю сталі беларускія інстытуцыі.

Галоўнай з іх стаў Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт), створаны ў 1922 годзе. Першапачаткова фалькларыстыка не была вылучана ў ім як самастойны даследчы напрамак. Толькі ў 1925 годзе тут была створана Этнаграфічная секцыя, аб’яднаўшая як беларускіх этнографаў, так і фалькларыстаў.

Этнаграфічная секцыя актыўна занялася наладжваннем даследчай працы ў рэспубліцы. Быў створаны спіс прац для выдання, распрацаваны планы, метады і праграмы для збору фальклорнага і этнаграфічнага матэрыялу на месцах. Праца секцыі карысталася папулярнасцю, яе падтрымлівала вялікая колькасць па-заштатных карэспандэнтаў на месцах.

У 1927 годзе Інбелкульт быў зноў рэарганізаваны, секцыя этнагарфіі была ператворана ў кафедру этнаграфіі, якая была раздзелена на дзве камісіі: па вывучэнню быту і матэрыяльнай культуры і па вывучэнні фальклору - апошнюю ўзначаліў М. Піятуховіч.

Другім важнейшым цэнтрам, які вызначаў развіццё міжваеннай беларускай фалькларыстыкі было Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК), створанае на базе Інбелкульта ў 1923 годзе. ЦБК ажыццяўляла кіраванне працэсам збору і фіксацыі рознага роду навуковага матэрыялу. Для гэтага Бюро ЦБК праводзіла актыўную працу па стварэнні краязнаўчых таварыстваў і ажыццяўляла агульнае кіраванне іх дзейнасцю, а таксама арганізоўвала краязнаўчыя з’езды. У Бюро траплялі ўсе краязнаўчыя матэрыялы, значную масу сярод якіх займалі даныя да слоўніка жывой беларускай мовы і фальклорныя творы.

Галоўным перыядычным выданнем не толькі ЦБК, але і ўсёй беларускай гуманітарыстыцы міжваеннага перыяду быў штомесячны часопіс “Наш край”, які выдаваўся з 1925 да 1933 г. (з 1930 г. як “Савецкая краіна”). На старонках часопіса друкаваліся артыкулы як навукоўцаў, так і простых краязнаўцаў, у тым ліку прысвечаныя беларускаму фальклору. Тут жа былі апублікаваныя

“Праграма-інструкцыя для збіральнікаў беларускай музычна-этнаграфічнай творчасці” і “Праграма збірання вуснай народнай творчасці”.

Адным з важнейшых напрамкаў дзейнасці беларускіх фалькларыстаў міжваеннага перыяду было правядзенне палявых экспедыцый у розныя куткі новай краіны. Так у 1924 годзе адбылася экспедыцыя на Магілёўшчыну, куды выехалі этнограф і фалькларыст А. Сержпутоўскі і кампазітар Я. Прохараў. Цягам месяца ў Горацкім, Чаўскім, Мсціслаўскім і Клімавіцкім раёнах даследавалі мову, творчасць і быт мясцовага насельніцтва. А. Сержпутоўскі запісаў 200 тэкстаў беларускіх песень, а атксама казкі і іншыя празаічныя творы, яго калега на слых і з дапамогай фанографа зафіксаваў каля 150 мелодый.

У 1927 г. І. Сербавым і А. Шлюбскім была даследавана мова, народны быт, матэрыяльная і духоўная культура паўночнай часткі Смаленскай губерніі. Для вывучэння народных песень у Тураў і Мазыр выязджаў сакратар песеннай камісіі А. Грыневіч. У 1929 годзе ён жа ездзіў разам з У. Ігнатоўскім на Полаччыну і Віцебшчыну, а пасля самастойна зноў на Мазыршчыну, дзе запісаў звыш 200 народных песень.

Пералічанае – толькі прыклады і невялікая частка зробленага беларускімі фалькларыстамі ў міжваенны перыяд. Толькі невялікая частка гэтых матэрыялаў была апублікаваная, а большасць была страчана ў ваенны час. Нягледзячы на розныя неспрыяльныя абставіны, беларускімі фалькларыстамі ў міжваенны час быў апублікаваны шэраг каштоўных прац, якія змяшчаюць даследаванні і матэрыялы па каляндарнай абраднасці беларусаў.